*Л.Г.Бараноўская, аспірантка кафедры беларускай літаратуры Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Анімалістычная тэма ў беларускай літаратуры

Анімалістычная тэма ў беларускай літаратуры мае багатую гісторыю, карані яе ўзыходзяць да вуснай народнай творчасці, дзе найбольш яскрава яна ўвасоблена ў казках пра жывёл. Створаныя ў іх анімалістычныя вобразы маюць алегарычны сэнс і нагадваюць чалавечыя характары, шмат гавораць нам пра ўзаемаадносіны паміж людзьмі (казкі “Коцік і пеўнік”, “Пра мужыка і лісу” і г.д.).

Цэлы калейдаскоп вобразаў фауны прадстаўлены ў помніках старажытнай літаратуры, дзе анімалістычныя матывы звязаны з пейзажам, побытам людзей (“Песня пра зубра” М.Гусоўскага). У многіх творах XIX ст. вобразы фауны маюць алегарычны сэнс (“Кепска будзе!” Ф.Багушэвіча і інш.). У XX ст. да анімалістычнай тэмы звярталіся класікі беларускай літаратуры Я.Купала, Цётка, К.Чорны, М.Танк, Я.Колас, У.Караткевіч і інш. Мастацкая анімалістыка ў беларускай літаратуры XX ст. цесна звязана з экалагічнай праблематыкай, з чарнобыльскай тэмай. У праграмах па беларускай літаратуры творы на анімалістычную тэматыку ў асноўным прапанаваны для вывучэння ў сярэдніх класах. Гэта, паводле праграмы пад рэдакцыяй В.Ляшук, “Цюцік” Я.Брыля (V клас), “Губаты” Г.Далідовіча, “Львы” І.Пташнікава (VI клас), “Рэкс і Казбек” А.Пальчэўскага (VII клас) і іншыя. Па праграме, створанай пад кіраўніцтвам М.Лазарука, у сярэдніх класах вывучаецца апавяданне “Былі ў мяне мядзведзі” У.Караткевіча, “Алені” І.Пташнікава (V клас), “Дыялог з мурашом” Г.Бураўкіна (VI клас), “Губаты” Г.Далідовіча (VII клас) і іншыя.

Большасць твораў пра жывёл, якія прапанаваны для вывучэння ў школе, закранаюць тэму ўзаемаадносін чалавека і прыроды. У апавяданнях І.Пташнікава "Алені", "Былі ў мяне мядзведзі" У.Караткевіча паказваецца, як прыручаныя чалавекам звяры гінуць, калі трапляюць на свабоду. У.Караткевіч выступае як пісьменнік-гуманіст, для якога свет жывой прыроды — гэта свет унікальны і варты чалавечай любові, спагады, шанавання. З любасцю і замілаваннем апісвае аўтар маленькага Бурыка: "Шчанюк быў велічынёю з рукавічку, маленькі-маленькі, светлы. І вочкі былі ці то сінія, ці то з блакітнай каламуццю, як то бывае ў шчанюкоў..." [3, с. 406]. Апісанне жыцця мядзведзя ў людзей прасякнута тонкім гумарам. Што ж чакае жывёлу на волі ў далейшым? Далейшы лёс Бурыка застаўся невядомым. Толькі адзін раз сустрэўся з ім галоўны герой апавядання і то засумняваўся, ці сапраўды гэта быў яго Бурык. Іншая сітуацыя склалася з другім мядзведзем Тупам, які таксама быў адпушчаны ў лес. Апавяданне мае трагічны фінал, бо жывёліна была застрэлена людзьмі, якія палічылі яе небяспечнай. Спачатку прыручыць, а потым адпусціць на волю — такі ўчынак чалавека аўтар называе здрадай: "Паляванне толькі тады паляванне, калі яно адзінаборства. То што ўжо казаць пра звяроў, якіх мы кідаем у рабства, прывучаем любоўю, а тады забываем толькі за тое, што яны любяць нас і шукаюць нас.

Было гэта так, як быццам я сам адвёў сябра ў камеру смяротнікаў" [3, с. 425].

Спасцігаючы свет жывёл, спрабуючы зразумець яго, У.Караткевіч у сваім творы пярэчыць устаноўцы Бібліі, паводле якой чалавеку наканавана быць царом прыроды, пісьменнік сцвярджае роўнасць усяго жывога на зямлі. Згадаем наступныя біблейскія радкі: "І сказаў Бог: створым чалавека по вобразу Нашаму; і да ўладараць яны над рыбамі марскімі, і над птушкамі нябеснымі, і над скацінай, і над усёй зямлёю, і над усімі гадамі, паўзунамі на зямлі" [2, с. 1]. Стаўленне У.Караткевіча да фауны раскрывае глы-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ока духоўны змест яго пісьменніцкай творчасці, дапамаае адчуць маральныя перакананні і прыярытэты чалавека учаснага экалагічнага мыслення.

Гуманістычнай пазіцыі ў адносінах да жывой прыроды рытрымліваецца і І.Пташнікаў у сваіх апавяданнях. У кольныя праграмы ўключаны апавяданні І.Пташнікава Львы" і "Алені". У гэтых творах аўтарскія адносіны да рыроды прасякнуты шчымліва-мінорнай ноткай спачуванія, трывогай пра яе будучыню. Гэты ж матыў адчуваеца і ў апавяданні У.Караткевіча "Былі ў мяне мядзведзі".

Амаль звычайная гісторыя пакладзена ў аснову апавяання "Алені": у галодныя пасляваенныя гады ляснік са заім знаёмым забіваюць аленя для таго, каб накарміць ям'ю. Маленькая дачушка ляснічага Ірка сябравала з Рагатым (тым аленем, якога забілі). І.Пташнікаў спрабуе заглянуць у душу як чалавека, так і жывёлы, паказвае іх заемаадносіны.

Аўтар малюе традыцыйны, паводле славянскіх уяўленняў, вобраз аленя, які абагаўляўся ў дабіблейскія часы. Паляванне на яго было галоўным промыслам, адсюль бярэ вытокі культ аленя. Гэты матыў прысутнічае на галаўных уборах шаманаў, што сведчыць аб мудрасці жывёлы ва ўяўленнях язычнікаў. Яго розум, высакароднасць прадэманстраваны і ў гэтым творы. Калі дзяўчынка працягнула аленю кавалачак хлеба, то Рагаты не ўзяў яго. Ён толькі лізнуў языком руку, як быццам сапраўды ведаў, што адбірае ў дзіцяці адзіны ласунак. Але ж аленя забівае бацька, каб накарміць яе, Ірку. Карыслівасць, жорсткасць людзей і добразычлівасць звера супрацьстаяць адзін аднаму. Драматызм і напружанасць сюжэта скіраваны на асвятленне гэтага кантрасту.

Даследчык літаратуры М.Эпштэйн піша: "Анімалізм як творча адказныя адносіны чалавека да жывёльнага свету - адзін з важнейшых сродкаў пашырэння сучаснага гуманізму, які выходзіць з наіўнай сваёй стадыі "абагаўлення" чалавека — да сталага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння з усімі формамі жыцця на зямлі" [9, с. 87].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мастацкае асваенне свету жывёл — адна з тых праблем, дзе сустракаюцца інтарэсы этыкі і эстэтыкі, экалогі і культуралогіі. Менавіта жывёлы ўяўляюць сабой бліжэйшы, роднасны чалавеку свет прыроды, які ў найбольшай ступені мае патрэбу ў абароне. Асабліва сёння, калі экалагічная праблема ўскладнілася чарнобыльскай катастрофай. У апавяданні І.Пташнікава "Львы" анімалістычная тэма перакрыжоўваецца з чарнобыльскай. Традыцыйнае для беларускай літаратуры апісанне жывёл набывае ў гэтым творы псіхалагізаванае выяўленне. У абмалёўцы вобраза сабакі пісьменнік выкарыстоўвае такі прыём, як анімалістычны псіхалагізм. Стан здароўя Д'жукі, пачуцці і перажыванні людзей, грызня сабак, выратаванне ад кулі міліцыянераў — усё гэта адлюстравана праз светаўспрыманне сабакі Д'жукі. Такі мастацкі прыём дапамагае больш ярка ўсвядоміць сітуацыю, у якой апынуўся жывёльны свет пасля Чарнобыля.

У сваіх творах, дзе шырока выкарыстоўваецца анімалізм, І.Пташнікаў кожны раз акцэнтуе ўвагу на тым, што гінуць жывёлы не самі па сабе, а па віне чалавека. Гэта і браканьерства ("Алені"), і вынікі чарнобыльскай катастрофы ("Львы"), і проста безадказнасць, нежаданне прытрымлівацца гуманізму, маральнасці ў паводзінах, той пазіцыі, пра якую гаворыць Маленькі прынц з вядомай казкі А. дэ Сент-Экзюперы: "Мы заўсёды ў адказе за тых, каго прыручылі" ("Арчыбал" і інш.).

Трагічны фінал і ў "Пагоні" І.Пташнікава. Празаік працягвае сусветна вядомы сюжэт рабінзанады — барацьбы за выжыванне. Гэта закон, які пануе ў жывёльным асяродку і які дзейнічае ў свеце людзей, што і паказвае аўтар апавядання. Мастацкі свет пташнікаўскіх твораў, які "насяляюць" жывёлы, не зусім адназначны. Калі ў "Аленях" і "Львах" звяры існуюць як рэаліі прыроды, то ў такім апавяданні, як "Пагоня", анімалістычныя вобразы набываюць сацыяльную значнасць. І часам цяжка сказаць: чалавек перад намі ці жывёла? У гэтым праяўляецца язычніцкае (паганскае) уяўленне чалавека пра мадэль

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ыцця грамадства, прыроды ў цэлым. У "Пагоні" вобразы жывёл, акрамя таго, што ўспрымаюцца як рэальныя істоты, маюць алегарычны характар адлюстравання. Жорсткія законы, паводле якіх жывуць звяры дзеля таго, каб выжыць, нагадваюць законы ўладкавання сучаснага грамадства. Вось як адгукнуўся на "Пагоню" У.Мехаў: "Апавяданне, зразумела, не пра жывёльны свет, хоць дзейныя асобы ў ім лось і ваўкі (можна чатырохногіх называць асобамі?). Яно пра нас, пра людзей. Звярыная грызня на высе, дзе ваўкі зжэрлі лася і ў неспацелым усё-такі холадзе накінуліся адно на аднаго — алегарычнае адлюстраванне таго, што адбываецца вякі і вякі між людзей" [4, с. 4].

Анімалістычныя вобразы дапамагаюць вытлумачыць сацыяльныя прыярытэты грамадства. Жывая прырода выконвае важную ролю пры мастацкім пазнанні жыцця ў творах І.Пташнікава. Сапраўды, як зазначае даследчык С.Андраюк, у творах пісьменніка "ўзаемадзеянне чалавека з навакольным светам пастаяннае, шматбаковае і шматаспектнае. З абставінамі першага плану (прырода, побыт, асабістыя ўзаемаадносіны, праца) — непасрэднае, шырокае, кабліва моцнае і інтэнсіўнае. З абставінамі другога, вышэйшага плану (грамадска-сацыяльнымі) — больш апасродкаванае, дзесьці як бы выбіральнае. Пры чытанні стварается ўражанне, што абставіны вышэйшага плану шмат чым нібы паглынаюцца абставінамі першага плану, якія ў выніку набываюць большую шчыльнасць, глыбіню, маштабнасць" [1, с. 11].

Парадак уладкавання грамадства, узаемаадносіны людзей паміж сабой, уздзеянне чалавека на акаляючае асяроддзе... Гэтыя пытанні вучні пачынаюць па-сапраўднаму асэнсоўваць у старэйшых класах, найперш тады, калі вывучаецца прадмет "Чалавек і грамадства". Хацелася б параіць складальнікам праграм па літаратуры ўвесці для вывучэння апавяданне "Пагоня" І.Пташнікава ў старэйшых класах, дзе бракуе твораў на анімалістычную тэму.

Мастацкая анімалістыка У.Караткевіча, І.Пташнікава з'яўляецца наватарскай для беларускай літаратуры. Яе вы-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вучэнне — адзін з цікавых аспектаў, які заслугоўвае ўвагі таму, што ў сучаснай школе вельмі важна сфарміраваць гуманістычную і экалагічную свядомасць асобы.

1. *Андраюк С.* Чалавек на зямлі: Нарыс творчасці І.Пташнікава. — Мн.: Маст. літ., 1988.

2. Библия. Книги священного писания Ветхого и Нового Завета. — Chicago, USA, 1990.

3. *Караткевіч У.* Збор твораў: У 8 т. — Мн., 1988. — Т. 2.

4. *Мехаў У.* Нельга не парадавацца // ЛіМ. — 1999. — 20 жніўня.

5. Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. V—XI класы / Пад рэд. В.Ляшук. — Мн., 2000.

6. Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. V—XI класы / Пад рэд. М.Лазарука. — Мн., 2000.

7. *Пташнікаў І.* Львы. Апавяданні. — Мн.: Юнацтва, 1991.

8. *Пташнікаў І.* Пагоня // Беларуская думка. — 2000. — № 4. — С. 182—192.

9. *Эпштейн Н.* Мир животных и самопознание человека // Художественное творчество: Вопросы комплексного изучения. Человек—природа—искусство. — Л.: Наука, 1986.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова